## № 50. Ганьне Бабарэцы

*24.VII.1931*
*Слабадзкой*

Дзень добры, любая дарагая мая Анечка.

Калі ты яшчэ ня выехала да мяне, дык і добра. То–ж я покі ня маю кватэры і буду, пэўна, мецць не раней як праз 1–1½ тыдні. Сёньня быў у горсавеце. Далі пісульку ў ЖАКТ, а тут сказалі зайсьці праз 2 дні, мо' й будзе пакоік які. Прыватную знайсьці цяжка, але пакуль што шукаю. Мешчуся тым часам у доме селяніна (50 к[апеек] за суткі). Да сёньняшняга дня адпачываў — купаўся, аглядаў горад і мясцовасьць, прыглядаўся да людзей і рэчаў. З сёньняшняга пачынаю шукаць працы. Быў ужо ў некалькіх установах. Нібыта абнадзейваюць, што працу на рублёў 80 можна дастаць. Ну дык вось, як бачыш, і пэрспэктывы праясьняюцца. На хлеб зарабіць можна будзе, як быццам. Прыдзецца стаць, калі ўдасца, на рахунковую работу, а калі не, то ўзяцца за фізычную. Балазе, сілы такія–сякія яшчэ захаваліся. Але гэта ўсё–ж я стаўлю пакуль што на другі плян, а першае — гэта знайсьці кватэру. А то от жывеш, усяроўна як той казаў, „да запатрабаваньня“. Любая мая, мо' лепш было–б, калі ты шчэ ня выехала, адлажыць тваю паездку. Усё–ж як не кажы, а цяжка ў такой абстаноўцы спатыкацца. Зрэшты, угаворваць ня буду. Сама, любая, узваж і рашай. Лісты мае ты, пэўна–ж, ужо атрымала, а ў іх я выказаў свае меркаваньні. Ты ў лісьце пытаеш, што прывезьці. Ведаеш, любая, каб хіба ўжо ня ведаў, што значыць дарога, то тады мо' лягчэй гаварылася, што захапіць з сабою. А так дык і сам ня ведаю, што й казаць. Мне вельмі ня хочацца, каб ты пакутавала ды мучылася. Мяркуй сама. Тугавата тут з усім. Ведаеш, такі горад, што от, скажам, пасуды якое дык днём з агнём аніякай ня знойдзеш: ні нажа, ні відэльца, ні лыжкі, ні міскі. Балазе, недалёка Вятка, там, кажуць, усё шчэ можна дастаць. З харчамі, пакуль не ўлаштаваўся з кватэрай, бадай, тое самае. Хаджу ў сталоўку, абеды посныя (40–45 кап.) Дастаць усё–ж можна амаль усё, толькі былі–б грошы. Усё — гэта мука, гародніна, малако, хлеб… Атрымаў ужо картку на хлеб у ЦРК. Мёртва ўсё–ж кругом. Ліста ня пішу, бо няма дзе прыгарусьціцца.

Будзь здарова і весела. Цалую Вас усіх моцна–моцна.

Ваш *Адам*.

## № 51. Ганьне Бабарэцы

*26/VII.1931*
*Слабадзкой*

Любая мая Анечка!

Калі ты яшчэ ня выехала, то й добра зрабіла. Кватэры я яшчэ не знайшоў. Быў у ЖАКЦе, там сказалі праз пару дзён зайсьці. Сёньня буду зноў. Наконт працы таксама нічога яшчэ ня выясьнілася. Нам дазволена займаць пасады толькі шчотных і канторскіх работнікаў. Патрэба ў іх тут ёсьць, і не малая. Але калі зьявішся, дык як скажаш хто ты, дык і пачынаюць глядзець скоса. У пары месц дэкляруюць, што мо' й будзе работа на руб. 70–80. Мае думкі наконт электрастанцыі даводзіцца перастройваць, бо хоць і ёсьць тут невялічкая электрастанцыя, ды летам яна не працуе, а толькі ўзімку. Вытворства–ж якога–небудзь мэталёвага тут няма. Так вось прыходзіцца пераключацца з сваімі думкамі на іншыя рэйкі. Тут ёсьць фабрыка